Векапомнае. Літаратурна-дакументальная экспазіцыя «Залатая раніца беларускага адраджэння» адкрылася ў Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры. Экспазіцыя раскрывае літаратурны працэс Беларусі ў 1920-я гг. праз дэманстрацыю матэрыялаў, звязаных з галоўнымі літаратурнымі згуртаваннямі таго часу — «Маладняк», «Узвышша», «Полымя», БелАПП. Акрамя таго, тут змешчаны рэдкія дакументы з Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва, кніжныя выданні бібліятэчкі часопіса «Маладняк» з фондаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Праект прысвечаны пісьменнікам-юбілярам 2019 года: А. Бабарэку, М. Лынькову, А. Якімовічу, М. Хведаровічу, П. Трусу, А. Дудару, З. Аксельроду, С. Дарожнаму, В. Маракову, Л. Калюгу, М. Лужаніну, З. Бандарынай, А. Куляшову.